**ТАРАСАЎКА** — пасёлак у Беладубраўскім сельскім Савеце, за 31 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў—Сураж, 192 км ад Магілёва, на ПнЗ мяжуе з лесам. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Саматэвічы — Касцюковічы.

Заснаваны ў 1920-х гадах перасяленцамі з суседніх вёсак. З сакавіка 1924 года ў БССР, з 17 ліпеня 1924 года ў Касцюковіцкім р-не. У Вялікую Айчынную вайну 29 верасня 1943 года вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Паводле перапісу 1959 года – 135, у 1970-м годзе 83 жыхары. У 1986 годзе 16 гаспадарак, 35 жыхароў, у складзе саўгаса “Саматэвічы” (цэнтр – вёска Саматэвічы). Складаецца з кароткай прамалінейнай вуліцы, арыентаванай з ПдЗ на ПнУ і забудаванай аднабакова драўлянымі сялянскімі хатамі. У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС жыхары адселены.